# Мая Радзіма – Беларусь

***Крылова Аляксандра,***
***дзяржаўная ўстанова адукацыі***
***“Сярэдняя школа № 28 г.Магілёва”, VI “Б” клас***

Кастрычніцкі вечар. Першы дзень доўгачаканых канікулаў. Мы з аднакласнікамі і настаўнікамі вяртаемся з экскурсіі ў Мірскі замак і Нясвіжкі палац. Усе стаміліся за дзень, таму ў аўтобусе ціха-ціха, хтосьці дрэмле, хтосьці слухае музыку, а нехта, як я, думае пра сённяшнюю вандроўку.

Восеньскі вечар надыходзіць хутка, за вокнамі згушчаецца змрок, цёмна і ў аўтобусе. Мне вельмі ўтульна, я сяджу, завярнуўшы ногі на сядзенне, час ад часу адпіваю глыток духмянага гарачага чаю і пазіраю ў акно. А там церусіць надакучлівы дождж, налятае парывамі вецер, хістаючы дрэвы. Мільгаюць знаёмыя і любыя да болю краявіды маёй зямлі. І мяне зараз не засмучае нават надвор’е. На душы спакой і замілаванне. Я ведаю, што наперадзе яшчэ некалькі гадзін шляху, а ў Магілёве мяне сустрэнуць мама і тата. І я па дарозе дадому, а потым і за вячэрай буду таропка расказваць ім пра ўбачанае і пачутае, паказваць зробленыя фотаздымкі. Вельмі востра зараз адчуваецца маё простае чалавечае шчасце.

Аўтобус мерна пагойдваецца, шаргацяць па мокрым асфальце яго колы. І пад гэтыя аднастайныя гукі я неяк незаўважна засынаю.

Раптоўна я чую матулін голас, які пяшчотна кліча мяне: “Дачушка, любая мая!” Я з цяжкасцю расплюшчваю павекі і ніяк не магу даўмецца: дзе ж гэта я? Няма ўжо ні аўтобуса, ні восеньскага вечара. Халаднаватае жнівеньскае світанне, я, звярнуўшыся ад холаду калачыкам, ляжу на купіне пад старой ялінай. Вакол цёмны лес, скрозь вяршаліны дрэў бачна неба, якое ледзь-ледзь пачынае ружавець. Ад зямлі патыхае вільгаццю, сцелецца туман, моцна пахне грыбамі. Лес жыве звычайным ранішнім жыццём: час ад часу зрываюцца з галін і падаюць на мяне буйныя кроплі, прымушаючы здрыганущца ад холаду, раздаюцца таемныя шолахі, нібыта саромеючыся, нясмела пачынаюць высвістваць птушкі. Паглядзеўшы на свае босыя ногі, на старэнькую старадаўнюю даматканую сукенку, я разумею, што, пэўна, я апынулася ў іншым стагоддзі. Неяк раптоўна я ўсведамляю, што я зараз простая беларуская дзяўчына, якая жыла са сваімі бацькамі ў наваколлі Мірскага замка ў другой палове XVI стагоддзя. Хатка ў нас была маленькая, надзел зямлі таксама мізэрны. Бацькі хадзілі на падзённую працу, я глядзела малодшых брата і сястрычку. Цяжка жылі, працавалі з ранку да вечара, а ўсё роўна і галадаць даводзілася. Ды яшчэ і ворагі не раз нападалі, адбіраючы апошняе. А нядаўна здарылася чарговая бяда: на беларускія землі напалі палякі. Бацьку майго забілі, маці з малымі забралі ў палон, хату з няхітрай маёмасцю спалілі. Нейкім цудам мне ўдалося выратавацца, і вось ужо колькі дзён хаваюся я ў навакольных лясах, неяк перабіваючы голад ягадамі і грыбамі. Ісці мне няма куды: ні родных, ні хаты, ніводнага куточка, дзе можна было б прытуліцца. Вораг асаджае Мірскі замак. І такая крыўда грудзі

сціскае: якая багатая мая зямля, якая прыгожая, а жыць простаму чалавеку няма як! Усё лепшае ў паноў і князёў: і ядуць яны соладка, і апранаюцца багата, а беднаму чалавеку нічога не застаецца. Перабіваецца небарака неяк ды ўвесь час баіцца, абы вайны не было. А вось і яна – вайна, якая апошняе адбірае. Слёзы цякуць у мяне па твары ад жаласці да сябе, да забітага бацькі, да родных, якіх я наўрад ці ўжо яшчэ калі ўбачу. Я ўтыкаюся носам ў калені і ўпадаю ў выратавальнае забыццё.

Раптам разумею, што дакранаюся тварам да нечага брыдкага, халоднага і цягучага. Я ўздрыгваю, рыўком узнімаю галаву і разумею, што стаю па горла ў балотнай вадзе. Побач са мной стаяць яшчэ людзі: жанчыны з малымі на руках, старыя, дзесьці нават кароўка віднеецца. Усе маўчаць, недзе раздаюцца стрэлы, цягне дымам. Недалёка ад нас чуюцца галасы. Што гавораць?... Я напружана прыслухоўваюся, але нічога не магу зразумець: мова чужая, нібы гусі гергечуць. Я зноў не ў сваім стагоддзі? Так, ужо бліжэй да сваіх дзён, але ўсё яшчэ не дома. Вялікая Айчынная вайна. Лепельскія лясы. Нямецкая аблава прымусіла людзей шукаць выратавання ў балоце. З учарашняга вечара ўсе людзі, што засталіся ў вёсцы, стаяць у гэтым балоце і моляцца ўсім вядомым і невядомым багам, каб пранесла навалу. І я разумею, што маё адзінае і самае вялікае жаданне зараз, каб закончылася вайна. Мы ўсё вынесем, выцерпім, абы толькі не было вайны. Чужыя галасы набліжаюцца, ужо віднеюцца варожыя каскі. Маё сэрца пачынае калаціцца так, што, здаецца, стук яго чуваць далёка-далёка. У мяне пачынае кружыцца галава, я ледзь не падаю ў гэтае балота, у якім шукаю выратавання. А перад вачыма мільгаюць нібыта фотаздымкі майго даваеннага шчаслівага жыцця. Я стараюся ўдыхнуць больш паветра, каб мне палепшала, і…

Прачынаюся на сядзенні аўтобуса. Мы стаім, бо прыехалі ў родны горад, тата з мамай з нецярпеннем чакаюць, пакуль я выйду з аўтобуса.

Дома, ужо лежачы ў сваім ўтульным ложку, я думаю, як добра, што я нарадзілася і жыву ў цудоўнай, вольнай і мірнай Беларусі. Мая краіна выклікае ў мяне самыя цёплыя і светлыя пачуцці. Я люблю беларускія гарады з іх чыстымі і прасторнымі вуліцамі, нашу багатую прыроду, няхай сабе і не экзатычную, сціплыя беларускія краявіды. Я ганаруся складаным гістарычным мінулым маёй краіны, старажытнымі цэрквамі і касцёламі, замкамі і палацамі, сядзібамі і маёнткамі, паркамі і запаведнікамі. Але больш за ўсё я ганаруся людзьмі, якія жывуць у нашай краіне. Яны вынеслі на сваіх плячах усе навалы, што выпалі на долю краіны, не зламаліся, не скарыліся. Не аддалі чужынцам сваю родную зямлю, адстаялі права на самастойнасць і незалежнасць, адбудавалі краіну і зрабілі яе яшчэ больш прыгожай і багатай.

Мая Радзіма – гэта месца, якое дае сілу жыць. Радзіма – месца, дзе паветра напоўнена энергіяй і святлом. Радзіма – месца, куды заўсёды цягне вярнуцца! Мая Радзіма – Беларусь! Яе прасторы, дабрыня і працавітасць яе народа даюць мне ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Я хачу, скончыўшы навучанне, стаць дастойным сваёй Радзімы чалавекам. Я хачу прыносіць карысць людзям, якія жывуць у маёй краіне. Я хачу, каб Беларусь развівался і заставалася заўсёды дастойнай памяці сваіх продкаў!